# З НОВЫМ ГОДАМ, ТАВАРЫШЫ!

**ДАРАГІЯ СЯБРЫ!**

На календары — апошні дзень снежня. 1981 год адыходзіць у гісторыю. У слаўны летапіс нашай сацыялістычнай Айчыны ён упісаны яркай старонкай. Гэта быў год XXVI з'езда КПСС, які вызначыў далейшыя напрамкі камуністычнага будаўніцтва ў краіне, стартавы год адзінаццатай пяцігодкі. Ацэньваючы зробленае, мы бачым, што на шляху да светлай будучыні зроблены ўпэўнены крок. Аб гэтым сведчаць і шматлікія рапарты працоўных калектываў аб датэрміновым выкананні планавых заданняў, паспяховым завяршэнні высокіх сацыялістычных абавязацельстваў.

Напярэдадні новага года савецкія людзі ў абстаноўцы высокага працоўнага і палітычнага ўздыму разам з нашымі замежнымі сябрамі, усім прагрэсіўным чалавецтвам адзначылі 75-гадовы юбілей Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, вернага прадаўжальніка ленінскай эканамічнай, унутранай і знешняй палітыкі, нястомнага барацьбіта за мір ва ўсім свеце таварыша Леаніда Ільіча Брэжнева.

З пэўнымі дасягненнямі да новага года прыйшоў і шматтысячны калектыў нашага універсітэта. Свае намаганні мы накіроўвалі на далейшае ўдасканальванне вучэбна-выхаваўчага працэсу, павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй, паўнейшую рэалізацыю магчымасцей у развіцці навукі, больш цеснае ўмацаванне яе сувязей з вытворчасцю.

Сваё імкненне быць толькі на перадавых рубяжах пацвердзілі яшчэ раз студэнцкія атрады ў працоўным семестры-81 і на сельгасработах.

Універсітэцкі калектыў мае на сваім рахунку нямала карысных спраў у грамадскай дзейнасці. Працягвалася мэтанакіраваная работа па далейшаму развіццю мастацкай самадзейнасці, фізічнай культуры і спорту, павышэнню майстэрства вядучых спартсменаў.

Уступаючы ў новы, 1982 год, мы бачым перад сабою яшчэ больш складаныя і адказныя задачы. На іх паспяховае ажыццяўленне нас нацэльвае абавязак дастойнай падрыхтоўкі да 60-годдзя СССР. Для камсамольцаў — гэта яшчэ і патрыятычнае імкненне з высокімі паказчыкамі прыйсці да свайго галоўнага форуму — XIX з'езда ВЛКСМ.

Важнай палітычнай кампаніяй у новым годзе з'явяцца прадстаячыя выбары ў мясцовыя Саветы народных дэпутатаў.

Наперадзе — свая падзея і ў ардэнаноснага Гомеля. У надыходзячым годзе гамяльчане будуць адзначаць яго 840-годдзе.

Вось такім насычаным на важныя падзеі і памятныя даты чакаецца 1982 год. Для універсітэцкага ж калектыву ён стане знамянальным яшчэ і тым, што ў мікрараёне Валатавы нашы студэнты заселяць 13-павярховы інтэрнат кватэрнага тыпу, што ў значнай ступені дазволіць вырашыць жыллёвую праблему.

Уступаючы ў 1982 год, жадаем вам, дарагія сябры, новых здзяйсненняў у ажыццяўленні гістарычных рашэнняў XXVI з'езда КПСС, XXIX з'езда Кампартыі Беларусі, выдатнай вучобы, плённай навукова-педагагічнай дзейнасці, ударнай працы на карысць далейшага росквіту любімай Радзімы, вялікага асабістага шчасця!

РЭКТАРАТ, ПАРТКОМ, МЯСЦКОМ,
КАМІТЭТ ЛКСМБ, ПРАФКОМ.




ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 39 (488) | Чацвер, 31 снежня 1981 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап

*Навукова-тэарэтычная канферэнцыя*

## НАСТОЛЬНАЯ КНІГА ЖЫЦЦЯ

На мінулым тыдні ў аўторак на гісторыка-філалагічным факультэце адбылася навукова-тэарэтычная канферэнцыя па кнізе таварыша Л. І. Брэжнева «Успаміны». У актавай зале сабраліся студэнты, выкладчыкі, супрацоўнікі. На сцэне — партрэт Леаніда Ільіча, выстаўлены яго творы.

Канферэнцыю адкрыла дэкан факультэта дацэнт Т. І. Язэпава. Яна сказала:

— Наша сустрэча праходзіць у знамянальныя дні. 19 снежня ўвесь савецкі народ, прагрэсіўнае чалавецтва свету адзначылі 75-годдзе з дня нараджэння Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, Маршала Савецкага Саюза таварыша Л. І. Брэжнева. Тэлебачанне і радыё перадавалі на ўвесь свет цырымонію ўручэння яму ордэна Леніна і Залатой Зоркі Героя Савецкага Саюза, узнагарод краін сацыялістычнага супрацоўніцтва. Да цяперашняга часу працягваюць паступаць прывітанні і віншаванні Леаніду Ільічу ад арганізацый, працоўных, відных грамадскіх і палітычных дзеячоў з многіх краін нашай планеты. Гэта — прызнанне не толькі палітычнага кіраўніка нашай партыі і Савецкай дзяржавы, але і сведчанне аб шырокай прыхільнасці да той міралюбівай палітыкі, якую пад яго кіраўніцтвам праводзіць Камуністычная партыя, наша краіна — першая ў свеце краіна сацыялізму.

Перачытваючы кнігу таварыша Л. І. Брэжнева «Успаміны», — сказала далей Т. І. Язэпава, — яго аўтабіяграфічную трылогію «Малая зямля», «Адраджэнне», «Цаліна», звяртаючыся да яго жыцця і дзейнасці, мы бачым: лёс Генеральнага сакратара ЦК КПСС, кіраўніка Савецкай дзяржавы — глыбокае адлюстраванне гісторыі нашай сацыялістычнай Радзімы, шматнацыянальнага савецкага народа.



З вялікай увагай былі выслуханы змястоўныя і эмацыянальныя выступленні другакурснікаў гістфіла Віктара Лютынскага — «Жыццё па завадскому гудку», Лілії Плыгаўка — «Пачатак станаўлення» і пяцікурсніка Сяргея Ксянзова — «Жыццё ў імя партыі, у імя народа».

З вялікай цеплынёй было ўспрынята выступленне дацэнта кафедры гісторыі КПСС камуніста з 57-гадовым стажам І. А. Ільіных. Іван Апанасавіч — жывы сведка шматлікіх гістарычных падзей, пра якія апісваецца ў кнізе «Успаміны». Ветэран усхвалявана гаварыў аб пераемнасці пакаленняў, аб той слаўнай эстафеце, што перадаецца ад дзядоў бацькам і ад бацькоў дзецям і ўнукам.

Дацэнт кафедры рускай літаратуры У. М. Сабаленка гаварыў аб неацэннай каштоўнасці кнігі таварыша Л. І. Брэжнева «Успаміны» з пункту гледжання яе літаратурных асаблівасцей.

Падагульняючы вынікі навукова-тэарэтычнай канферэнцыі, Т. І. Язэпава адзначыла:

— Маладосць мы заўсёды звязваем з будучыняй, а будучыню — з мірам. «Адстаяць мір, — гаварыў таварыш Л. І. Брэжнеў на XXVI з'ездзе КПСС, — няма цяпер больш важнай задачы ў міжнародным маштабе для нашай партыі, нашага народа, ды і для ўсіх народаў планеты.

Адстойваючы мір, мы працуем не толькі для людзей, якія жывуць цяпер, не толькі для нашых дзяцей і ўнукаў, мы працуем для шчасця дзесяткаў будучых пакаленняў».

Гэтыя словы — палымяны наказ партыі савецкаму народу і адначасова сутнасць самога жыцця Леаніда Ільіча. Уся планета бязмежна ўдзячна яму за сапраўды тытанічную працу па захаванню і ўмацаванню міру на зямлі. Для мільёнаў людзей добрай волі яго імя стала сімвалам рэвалюцыйнага пераўтварэння свету, факелам свабоды і нацыянальнай незалежнасці, жыццесцвярджальнасцю пралетарскага інтэрнацыяналізму. Кніга «Успаміны» мае велізарнае значэнне для фарміравання асобы. Як і папярэднія творы Леаніда Ільіча Брэжнева, яна з'яўляецца сапраўдным падручнікам жыцця для савецкай моладзі, яркім прыкладам беззапаветнага служэння Радзіме, партыі, народу, справе міру і сацыялізму.

**Б. ВАЛОДЗІН.**

На здымку: на канферэнцыі выступае С. Ксянзоў.
Фота У. Чысціка.

## УДАСТОЕНА ДЫПЛОМА

У мінулым годзе праводзіўся агляд-конкурс бібліятэк вышэйшых навучальных устаноў краіны, прысвечаны 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. Яго пераможцам прызнана і бібліятэка нашага універсітэта. Яна ўзнагароджана Дыпломам аргкамітэта па правядзенню агляду-конкурсу. Узнагароду ўручыў калектыву бібліятэкі сакратар парткома ГДУ М. І. Старавойтаў на партыйным сходзе ўпраўлення універсітэта, дзе абмяркоўвалася пытанне яе работы па забеспячэнню студэнтаў падручнікамі, дапаможнікамі і метадычнай літаратурай.

(Наш кар.).

## *ВІНШУЕМ!*

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат матэматычнага факультэта, калектыў кафедры тэорыі функцый і функцыянальнага аналізу горача віншуюць асістэнта гэтай кафедры ЕРМАКОВА Уладзіміра Рыгоравіча з выпадку зацвярджэння яго ВАКам у вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.**

# Літаратурная старонка

Ольга КУРТАНИЧ

## КАРНАВАЛ

Опьяняюще и звучно
Манит музыкою зал.
Арлекин с улыбкой скучной
Всех зовет на карнавал.
Разноцветною полоской
Разрываясь, серпантин
Ставит время, ставит сноски
Маскарадного пути.
Хороводы водят маски.
Набегает смех украдкой.
И растаявшие краски
Стали нотною тетрадкой,
По которой музыканты
Туш играют карнавальный.
Игры в «салки». Игры в
«фанты».
Танец-приз. Конечно, бальный.
...Прибежишь домой усталый
По морозному пути
Облетают скучно на пол
От одежды конфетти.

Наталья САПОНЕНКО

★

Забыто всё осеннее,
Снежинки за окном...
Мы слушали Есенина
По радио вдвоём.
Ты слушал песню нежную
Из ясных тёплых слов,
Когда волной безбрежною
Звучал печальный зов
И рощи отшумевшей вдруг,
И стаи журавлей...
Наверно, не забыть мне, друг,
Мотива грусти в ней!
...И мчались сани синие
Неезженой тропой,
Бубенчики старинные
Звенели над рекой.
Забыто все осеннее,
Метели за окном...
Послушать бы Есенина
Когда-нибудь вдвоём!

ДА ЮБІЛЕЮ НАРОДНАГА ПЕСНЯРА

## НА САМАДЗЕЙНЫХ ПАДМОСТКАХ

Нядаўна ў Палацы культуры будаўнікоў гамяльчане, студэнты аддзялення беларускай і рускай мовы і літаратуры гісторыка-філалагічнага факультэта ГДУ прагледзелі п'есу Янкі Купалы «У купальскую ноч» у пастаноўцы фальклорна-тэатральнага калектыву «Жалейка», лаўрэата рэспубліканскага фестывалю моладзі.

...З даўніх часоў беларускі селянін марыў знайсці чароўную кветку-папараць, якая па народнаму паданню расцвітае адзін раз у год у ноч на Купалле .І той, хто яе знойдзе, будзе самым шчаслівым у свеце. У гэта свята распальвалі вогнішчы, вадзілі вакол іх карагоды, спявалі, дзяўчаты кідалі вянкі ў раку, гадалі на сваю долю. Ноччу моладзь ішла ў пушчу, каб знайсці чароўную кветку-папараць. Шукальнікаў падпільноўвалі злыя сілы: ведзьмы, лесуны, чэрці, русалкі. Але просты беларускі юнак Сымонка перамагае іх і знаходзіць кветку шчасця для сваёй каханай і усяго беларускага народа.

П'еса была напісана Я. Купалам па матывах народнага падання і гэта ўлічваў пры яе пастаноўцы рэжысёр «Жалейкі» М. Макарцоў. У інсцэніроўцы шмат фальклорных элементаў, што зрабіла яе вельмі блізкай да задумы аўтара твора. Добра выконвалі ролі Сымона і Купалачкі артысты Б. Пуншоў і Г. Булахава.

Спектакль атрымаўся цікавым, і гарачыя апладысменты гледачоў былі найлепшай узнагародай артыстам.

**В. ЯЦУХНА,**
**студэнт 1-га курса гістфіла, удзельнік фальклорнага гуртка.**

## Новыя імёны: АНАТОЛЬ КАЗЛОЎ

Сёння на нашай літаратурнай старонцы новае імя — Анатоль Казлоў. Зараз ён — студэнт гісторыка-філалагічнага факультэта універсітэта, вывучае беларускую і рускую мову і літаратуру. А да гэтага настаўнічаў, працаваў у рэдакцыі раённай газеты. Уражанні, назіранні яго кароткага жыцця становяцца асновай невялічкіх мастацкіх твораў, розных па жанрах — вершаў, замалёвак.

*Рыбацкія замалёўкі*

## ДАПАМОГА

Мора выглядала цяжкім, хмурым, да яго пасавала і неба, зацягнутае суцэльнай дымчатай хмарай.

Рыбакі, апранутыя ў прагумаваную вопратку, укладвалі рыбу ў ладныя скрыні, тут жа закрывалі іх, браліся за наступныя.

Лёгкі ветрык абдаваў мокрыя твары, часам падхопліваў луску і наклейваў яе куды мог.

Судна пасярод мора здавалася мізэрнай трэскай, закінутай сюды невядомай сілай, з якой забаўлялася пучына. Але гэта толькі на першы погляд. Траўлер ішоў упэўнена, непадпарадкоўваючыся ніякім знешнім сілам.

Напоўнены апошнія скрыні. Рыбакі ўзяліся змываць палубу. І тут, ужо не памятаю хто з іх, крыкнуў:

— Хлопцы, глядзіце, што дэльфін вырабляе!

Мы прыніклі да бартоў і ўбачылі дэльфіна. Ён плыў перад самым носам траўлера. Часам ныраў, поўнасцю знікаючы пад вадой, выскокваў і бег на хвасце, зноў ныраў.

— Во артыст, во малайчына. Трэба ж так, а!? — чуліся воклічы., — Глядзіце, глядзіце, зноў на хвасце бяжыць.

— Хлопцы, можа касяк хоча паказаць, ну няйначай!

— Проста з жыру гуляе.

Так наперабой балбаталі рыбакі. А дэльфін плыў сабе наперадзе траўлера, скакаў на хвасце, ныраў. Яму, як узнагароду, кінулі некалькі рыбін, але дэльфін не звярнуў на іх ніякай увагі.

— Тут штосьці не так, — прабурчаў стары рыбак. — Колькі плаваю, не бачыў, каб дэльфін адмаўляўся ад рыбы...

Азірнуўшыся навокал, той жа рыбак праз колькі хвілін дадаў: «Эге, так і ёсць, гляньце вунь туды, бачыце бялявую палоску, гэта дэльфін, нешта з ім, мабыць, здарылася».

Хуценька спусцілі на ваду лодку. Дэльфін імгненна слізгануў да яе і паплыў побач да бялеючай палоскі.

Другога дэльфіна паднялі на борт. Яго бок быў распаласаваны. Хто яго ведае, кім або чым, хутчэй усяго акулай. Судавы доктар з некалькімі рыбакамі прыняліся за аперацыю.

А праз некаторы час абодва дэльфіна ўжо плылі ззаду нашага карабля, сярод чорна-сініх хваль пад дымчатым небам.

*Абразкі*

## КРЫНІЧНАЯ ВАДА

З'ехаўшы з шашы, аўтобус затросся як у ліхаманцы. У ім знаходзілася з дзесятак пасажыраў. Перада мной сядзелі дзве бабулі. Адна з іх на каленях трымала трохлітровы бітончык. Вось аўтобус, нібы спатыкнуўшыся, рэзка затармазіў. Усіх штурханула наперад. У бабулі з рук выслізнуў бітончык і пакаціўся паміж сядзеннямі. З яго палілася вада. Бабуля ўсхапілася з месца, вохкаючы кінулася да пасудзіны. Падняла пусты бітончык, а на падлозе віднелася ладная лужа.

— Што ж мне рабіць? Божачкі мае, трэба ехаць зноўкі назад, — пачала жаліцца старая сваёй суседцы. — Везла паўсотню кіламетраў і не ўгледзела.

— А што ж вы везлі? — пацікавілася суседка.

— Вадзічку крынічную Парфенавічу майму, занядбаў бедалага, не падымаецца. А ўчора, з вечара, захацеў вады з той крыніцы, якую яшчэ яго бацька прыгледзеў і якой яны карысталіся. Кажа, нап'юся той вады і паздаравею. А мы ж трыццаць год як жывем у другім раёне. З ранку паехала, думала, як раз да вечара прывязу, ды вось як атрымалася.

...Аўтобус павольі каціў па дарозе. У пустым салоне сядзела бабулька, моцна трымаючы на каленях бітончык.

**Анатоль КАЗЛОЎ.**

Владимир ПАШУК

## Наташа Ростова

Снова и снова читая Толстого,
Образ прекрасный воочию зрю:
Вечно живая Наташа Ростова,
Нежная, добрая... С ней говорю,
Ею любуюсь и восхищаюсь,
И проникаюсь духом ее,
С милой Наташей я не прощаюсь:
С нею навеки сердце мое.
Жажда любви и внезапно — смятение,
Пылкий восторг и безумная страсть,
Юный порыв и живое волнение,
Женская слабость... В пропасть упасть,
Чтобы подняться и выжить. Дождаться,
Выстрадать, вырыдать, выстоять, вновь
В жизнь окунуться и снова — смущаться
И полюбить, и утратить любовь,
Чтобы опять любить и любиться,
Чтобы святейшей женщиной стать,
Чтоб, оступившись, не оступиться
Впредь, чтоб себя навсегда воссоздать
В детях, в потомках — так уж завещано,
Так уж заведено — в этом и суть,
В этом и роль твоя в мире, о женщина:
Жизнь сохранить и умножить! Ничуть
Не сомневаюсь в Наташе Ростовой
Я: от начала и до конца
Ее принимаю, влюбляюсь и снова
Ею любуюсь. Перо мудреца,
Гения мысль породили Наташу,
И без нее мир немыслим уж наш.
Не расплескать бы полную чашу
И не утратить Ростовых Наташ!
Снова и снова читаю Толстого,
Снова себе вдохновенье дарю.
Вечно живая Наташа Ростова —
Образ любимый воочию зрю.



ЗІМОВЫ ПЕЙЗАЖ. Фота У. Чысціка.

Лідзія КУКШТЭЛЬ

## БРАТУ

Я цябе адчуваю здалёк.
І да сэрца цягну зноў далоні
І баюся, што хтось незнарок
Засквазіць яго стужай зялёнай.
Я цябе адчуваю здалёк.
Не сумуй,
Што выходзіць не гладка
І што лёс сівізною апёк,
І ўсмешкі так скрыўлена
кладка.
Я цябе супакою, заву.
І пісьмом, як крылом, прыдам
веры...
Валасоў тваіх сум — белізну
Замалюю ў замаразак шэры.

★

**Жывеш не вечна, чалавек,**
**Перажыві ж у момант век!**
**М. БАГДАНОВІЧ**

Паднімае вецер у полі
Валасы зямлі — траву,
Разганяе неба бровы...
Гой, лю!
Абмываюць слязьмі хмары
Грудзі чорныя зямлі,
Глушакамі лес ўздыхае...
Гой, лі!
Пад грымоцце, бліскавіцу
Распушчу касу сваю,
Здрыгануўшы яснай зоркай,
Ападу ў руку тваю.

Ирина ГРЕБЕНЮК

## СЕКРЕТ ЖИЗНИ

Вся жизнь — кипение страстей.
То осчастливит, то ударит,
то поманит, как соловей,
то душу сыщиком обшарит,
то вдруг спасёт в последний
миг,
то вновь с лихой сведет бедою,
и с нею твой победный клик
уйдет, как с полою водою...
Но — видишь? —
зарево в окне!..
Но — вечный,
вечный танец звездный!..
И ты в любом жива огне
и в лапах у тоски бесслёзной.
Нельзя там ничего стереть —
цвета, иль звуки,
иль названья —
чтобы тебе
не умереть
от неживого
нестраданья!

Людмила ДЕМИДЕНКО

## ТЕНИ

Было холодно, зябко и хмуро
В этот вечер уныло-весенний.
Шли по улице три фигуры,
Перед ними — три длинные
тени.
Под ногами живыми сетями
Рассыпались ветвей отраженья,
И от спичек безмолвное пламя
Тоже наземь бросало тени.
А идущие вслед не знали:
Где же — истина, где —
виденье? —
Рядом с контурами стояли
И дрожали живые тени.

Людміла ШАЎЧЭНКА

★

Азірнешся, і сэрца сціснецца
Ад якогась няяснага болю.
Адляталі птушкі ў вырай —
Мяне клікалі за сабою.
Захінулі блакіт нябес воблакі,
Туманы над палямі сцелюцца.
Дождж імжыцца нуднымі
кроплямі,
Як праз сіцечка дробнае
сеецца.
Вецем дрэвы ў неба ўрэзаны,
Лісці быццам з чырвонай медзі.
Абрывае іх вецер гарэзлівы
І нясе па празяблай планеце.
Па дарозе раскінуты лужыцы,
Бы чыёсьці люстэрка
разбілася.
А кляновы лісток ціха
кружыцца —
То жар-птушкі пяро згубілася.

